# Рецензии

# Рэцэнзii

# Reviews

*Сінькова Л.* **Беларуская «звышлітаратура»**. Мінск : Кнігазбор, 2019. 224 с.

*Синькова Л.* **Белорусская «сверхлитература»**. Минск : Кнігазбор, 2019. 224 с.

*Sin'kova L.* **Belarusian «superliterature»**. Minsk : Knigazbor, 2019. 224 p.

Уніфікацыя працы, побыту, культурных традыцый і нацыянальных асаблівасцей, як характэрныя тэндэнцыі глабальнай сусветнай прасторы, сёння размываюць маральныя каштоўнасці, нормы, культурную спадчыну, мову – аснову ідэнтычнасці нацый. У гэтых умовах пераасэнсоўваюцца месца і роля літаратуры ў жыцці грамадства, узнікаюць не толькі новыя каналы распаўсюджвання мастацкіх твораў, але змяняецца змест мастацкіх практык, нараджаецца новая эстэтыка. Менавіта гэтым пытанням прысвечана кніга Людмілы Дзмітрыеўны Сіньковай «Беларуская "звышлітаратура"», якая з'яўляецца заканамерным працягам ранейшых даследаванняў аўтара і разам з тым крокам наперад у памкненні асэнсаваць познесавецкі і постсавецкі перыяд развіцця літаратурнага працэсу на Беларусі з улікам новых геапалітычных умоў, тэндэнцый і выклікаў сучаснага свету.

Імя Л. Д. Сіньковай (Корань) – доктара філалагічных навук, прафесара, выдатнага крытыка і літаратуразнаўцы – вядома далёка за межамі Беларусі. Яна з'яўляецца аўтарам больш за 200 публікацый у айчынным і замежным друку, сярод якіх такія знакавыя працы, як «Цукровы пеўнік: літаратурна-крытычныя артыкулы» (1996), «Беларуская проза ХХ стагоддзя: дынаміка жанравых структур» (1996), «Паміж тэкстам і дыскурсам: беларуская літаратура ХХ–ХХI ст.: гісторыя, кампаратывістыка і крытыка» (2013), шматлікія вучэбна-метадычныя дапаможнікі. Аднак не колькасць, а якасць, якая вызначае навуковы ўзровень гэтых прац, пацвярджае высокі статус даследчыцы ў навуковым асяроддзі. Л. Д. Сінькова – аўтарытэт для ўсіх, хто цікавіцца развіццём нацыянальнага прыгожага пісьменства.

У свой час Л. Д. Сінькова прыгадала выказванне класіка нацыянальнай літаратуры Я. Брыля: «Крытык адчувае сябе паміж Парнасам і пісьменнікам, а месца яго – паміж пісьменнікам і чытачом»[1]. Менавіта ў тым, каб наблізіць да чытача найперш сур'ёзную беларускую культуру, бачыць прафесар Л. Д. Сінькова сваю звышзадачу як крытыка і літаратуразнаўцы. Паняцце элітарнасці ключавое ў канцэпцыі новай кнігі, яно адсылае чытача як да класікі (тэкстаў М. Гарэцкага, К. Чорнага, У. Жылкі, М. Багдановіча ), так і да сучасных прэцэдэнтных твораў В. Быкава, А. Адамовіча, С. Алексіевіч, якія актуалізуюць, напаўняюць канкрэтыкай у нейкай ступені палемічны тэрмін А. Адамовіча «звышлітаратура». Паводле меркавання А. Адамовіча, якое ён адстойваў у няпростых умовах познесавецкай рэчаіснасці, «звышлітаратура – гэта ўсяго толькі звышнамаганне таленту (калі ён ёсць), звышнапружанне сумлення (калі ёсць), звышадказнасць твая асабістая за лёс роду чалавечага, чалавецтва»[2]. Л. Д. Сінькова пераканаўча даказвае, што арыгінальная думка А. Адамовіча пра тое, што сучасны свет, які знаходзіцца пад пастаяннай пагрозай глабальных апакаліптычных катастроф, павінен стварыць новую літаратуру,

[1]*Сінькова Л. Д.* Паміж тэкстам і дыскурсам: беларуская літаратура ХХ–ХХI ст.: гісторыя, кампаратывістыка і крытыка. Мінск : Паркус плюс, 2013. С. 3.

[2]*Адамовіч А.* З зялёнага сшытка // Крыніца. 2000. № 1(58). С. 37.

CC BY NC

новы эпас – звышлітаратуру. Гэта ідэя, якую ён тэарэтычна абгрунтаваў і практычна апрабіраваў у кнігах «Карнікі», «Я з вогненнай вёскі» (у суаўтарстве з Янкам Брылём і У. Калеснікам), «Блакадная кніга» (у сааўтарстве з Д. Граніным), знайшла сваё канчатковае ўвасабленне ў творчасці нобелеўскага лаўрэата С. Алексіевіч. Уплыў А. Адамовіча на сваю мастацкую практыку падкрэсліла і яна сама, у прыватнасці ў сваёй нобелеўскай лекцыі[3]. З удзячнасцю згадваючы імя настаўніка, С. Алексіевіч сцвярджала, што пра перажытыя беларусамі і ўсім чалавецтвам жахі павінен гаварыць сведка, пра гэты вопыт будзе напісана «звышлітаратура».

Вызначаючы сутнасць тэрміна, яго зместава-стылістычнае напаўненне, жанравую класіфікацыю ў раздзеле «Беларуская “звышлітаратура”: Васіль Быкаў, Алесь Адамовіч, Святлана Алексіевіч» аналізуемага выдання, прафесар Л. Д. Сінькова сцвярджае, што гэта «новая мастацкасць, “крыкавая эстэтыка”, якая, будучы мастацтвам (а ў жанры галасоў – і сведчаннем), не можа не быць яшчэ і справаю густу (які, дарэчы, прафесійная крытыка павінна развіваць). Сапраўды, гэта менавіта ломка старой формы і нараджэнне новай. Новае ж не кожны і не адразу ўбачыць і  зможа правільна ацаніць. Новая форма, паводле меркавання і пісьменнікаў, і даследчыцы, знаходзіць для сябе новую мастацкую мову, новы дыскурс. Ён, тым не менш, абумоўлены сталай нацыянальнай традыцыяй. «Інерцыя вядомай дакументальна-мастацкай стылістыкі замаруджвала выспяванне новай жанравай формы: жанр галасоў спачатку парасткам праглядваўся ў розных кантамінацыях дакументальнага, публіцыстычнага і мастацкага», – падкрэслівае Л. Д. Сінькова і даводзіць, што, адштурхоўваючыся ад журналісцкіх стратэгій, С. Алексіевіч «суствараe чужое маўленне з аўтэнтычных маналагічных плыняў. Такім чынам не літаральная стэнаграма, а своеасаблівы дакументальна-мастацкі магістрал: запіс выбраных, яскравых, ужо мастацкіх вобразаў-фактаў, унікальных, як усякае сведчанне рэальнага чалавека, і шматзначных, як усякі вобраз» (с. 42). У гэтым рэчышчы зразумела тая пільная ўвага, якая надаецца ў новай кнізе Л. Д. Сіньковай такой унікальнай з’яве, як дакументальна-мастацкая проза. Даследчыца закранае надзвычай актуальныя для сучаснага літаратуразнаўства праблемы. Падкрэсліваючы неабходнасць удакладнення і карэляцыі самога тэрміна «дакументальна-мастацкая проза», прафесар Л. Д. Сінькова разглядае цэлы масіў мастацкіх тэкстаў айчыннай літаратуры XX–XXI ст. з пункту гледжання ступені іх прыдуманасці ці непрыдуманасці (*fiction* or *non-fiction*). У выніку яна прапануе ўласную класіфікацыю дакументальна-мастацкіх тэкстаў з падзелам на дзве плыні: прозу *fiction* («прыдуманую»), у якой дамінуе мастацкі вымысел (і допускаецца імітацыя, містыфікацыя фактаў), і прозу *non-fiction* («непрыдуманую»), у якой дамінуе фактаграфічная аснова з адпаведнай жанравай дыферэнцыяцыяй і канкрэтнымі прыкладамі.

Як даследчыца, Л. Д. Сінькова надзвычай чуйная да тэндэнцый і выклікаў сучаснага глабалізаванага свету. Вывучаючы і прапагандуючы звышлітаратуру, спрабуючы данесці яе да масавай аўдыторыі, яна не пакідае па-за ўвагай і праблему масавай культуры, падкрэсліваючы няўхільнасць вяртання чытача да класікі. З уласцівым толькі ёй палемічна-задзірыстым пафасам Л. Д. Сінькова кідае выклік сучаснаму чытачу: «Літаратура для мас ніколі не пераможа класіку, не зможа заняць яе месца найперш таму, што кожнаму чалавеку наканавана расці і сталець. <…> Калі ж чытач хоча ўсё жыццё заставацца інфантылам, выключна звяном у харчовым ланцужку, то гэта яго асабістая праблема. Класічная літаратура тут ні пры чым» (с. 8–9).

Кніга «Беларуская “звышлітаратура”», ахарактарызаваная як зборнік літаратуразнаўчых і літаратурна-крытычных артыкулаў, – тым не менш з’ява надзвычай цэласная і канцэптуальна прадуманая. У ёй выразна вылучаюцца з’яднаныя паміж сабой сюжэтаўтваральныя лініі, якія на сёння пазначаюць і злучаюць найбольш блізкія кропкі сучаснага літаратуразнаўства. Найперш гэта дакументальна-мастацкія стратэгіі беларускай літаратуры ад «міжвольнага і трагічнага» дакументалізму М. Гарэцкага (А. Адамовіч) да новага эпасу самога А. Адамовіча і ўрэшце прозы галасоў С. Алексіевіч. Яшчэ адзін напрамак даследавання – задачы і сутнасць метадалогіі сучаснай літаратуразнаўчай навукі. Адным з галоўных прынцыпаў працы літаратуразнаўцы і крытыка прафесар Л. Д. Сінькова робіць «уважлівае стаўленне да твораў і творцаў, любоў да працы з тэкстамі» (с. 141), а таксама абавязковую для філолага «культуру ўспрымання, суперажывання, разумення, а затым інтэрпрэтацыі аб’екта даследавання» (с. 134). Л. Д. Сінькова засяроджваецца на праблемах сучаснага беларускага параўнальнага літаратуразнаўства. Адзначаючы, што беларуская кампаратывістыка – з’ява адносна маладая, прафесар заўважае некаторыя негатыўныя тэндэнцыі ў працах маладых даследчыкаў, калі «існуе спакуса параўноўваць што б там ні было адразу ж, па вонкавых супадзеннях, па “ключавых словах”, элімінуючы з’яву з гісторыка-культурнага кантэксту» (с. 121). Клопатам пра развіццё айчыннай літаратуразнаўчай навукі прасякнута выснова

[3]Нобелевская лекция Светланы Алексиевич [Электронный ресурс]. URL: https://www.culturepartnership.eu/article/nobelevskaya-lektsiya-svetlani-aleksievich (дата обращения: 01.02.2020).

даследчыцы, што «адмаўленне ад традыцыйнай метадалогіі ў кампаратыўных даследаваннях на карысць карэляцыі рознажанравых, рознавідавых, рознастылёвых, рознačасавых і рознакультурных з'яў шляхам спекулятыўнага (разумовага) збліжэння фармальных, маргінальных, вонкавых прыкмет вядзе да дэвальвацыі літаратуразнаўства як навукі» (с. 118–119).

Аўтарская зацікаўленасць мастацкімі і літаратуразнаўчымі тэкстамі, пра якія вядзецца гаворка, імкненне да суразмовы з чытачом, заклік да палемікі па дыскусійных пытаннях сучаснага літаратурнага працэсу і асэнсавання апошняга бягучай крытыкай і літаратуразнаўствам пранізвае ўвесь тэкст новай кнігі прафесара Л. Д. Сіньковай. Трывалыя веды, якія дазваляюць ствараць шырокі гісторыка-культурны кантэкст інтэрпрэтацыі тэкстаў, эсэістычная асацыятыўнасць і разам з тым навуковая выверанасць і дакладнасць фактаў і фармулёвак, постмадэрнісцкая іранічнасць і палемічная парадаксальнасць выказванняў робяць тэкст кнігі запамінальным і па-мастацку дынамічным, інтрыгуючым. Выданне ў пэўнай ступені правакуе чытача, заклікае яго да палемікі.

***Г. К. Тычко***[4]

[4]*Галина Казимировна Тычко* – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры периодической печати и веб-журналистики факультета журналистики Белорусского государственного университета.

*Галіна Казіміраўна Тычко* – доктар філалагічных навук, прафесар; прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Galina K. Tychko*, doctor of science (philology), full professor; professor at the department of periodical press and web journalism, faculty of journalism, Belarusian State University.

E-mail: *tychko@mail.ru*

*http:/orcid.org/0000-0002-9379-924X*